У мінулым годзе ён, ужо зусім сівы, але па-ранейшаму прыгожы беларус з радасцю і вялікім душэўным хваляваннем праз больш чым 50 гадоў паехаў у Германію. За мяжой праз гады адбылася тая сустрэча з маладосцю, з каханай Тэрэзай і роднай дачкой. І вось сёлетняя сустрэча на таксама гасціннай беларускай зямлі. Асабіста мяне ва ўсёй гэтай чалавечай гісторыі ўразіў і ўсхваляваў адзін факт. Гасціўшая ў бацькі ў Дзісне ягоная дачка-немка пасля наведвання мясцовага прадуктовага магазіна моцна расплакалася. Так стала шкада роднай крывінкі свайго тату, а звыклая для нас беднасць прылаўкаў моцна ўразіла еўрапейскую госцю. Беларуская рэчаіснасць, адсталасць, нізкая культура так і кідаюцца ў вочы на кожным кроку.

Калі здараецца часам мне і маім знаёмым прымаць гасцей з іншых, цывілізаваных краін свету, кожны раз адчуваеш нейкую няёмкасць. Міжволі тут задумаешся, чаму ж тыя пераможаныя намі немцы жывуць зусім па-іншаму ў адрозненне ад беларусаў? У тых мясцінах, адкуль прыехалі на Беларусь Райхерсдорферы, людзі і зарабляюць зусім інакш. Да прыкладу, галоўны ўрач бальніцы там штомесячна можа зарабіць у межах 7400—7500 марак, настаўнік сярэдняй школы 4600—4700, рабочы на аўтаканвееры 2200—2400, вадзіцель аўтобуса да 3500 і нават швачка да 2000 марак. У нямецкай валюце неяк адразу незразумела, але калі назваць месячны заробак прыбіральшчыцы ў суме 27 мільёнаў беларускіх рублёў, або тысячы марак, адразу ўсё становіцца на свае месцы.

Каб быць аб'ектыўным, варта прывесці і тамтэйшыя цэны. Яны могуць быць рознымі ў залежнасці ад прэстыжнасці магазіна, але ў сярэднім літр малака можна купіць у Германіі за 2 маркі, масла — 8—10, тварагу — 12—14, каўбасы ад 10 да 50 DM, кілаграм хлеба — за 4—8 марак. Адна плітка шакаладу каштуе 1,2—2,5, сок фруктовы — 2—3, літр піва — 3, віна —10, гарэлкі — да 15—20 марак. Штомесячныя расходы звычайнай нямецкай сям'і за электрычнасць, газ, ваду і тэлефон складаюць 300, а на закупы адзення і абутку — 400 марак. Кожны страціўшы работу, атрымлівае пажыццёва кампенсацыю ў памеры 60 працэнтаў ад сярэдняга заробку на апошнім месцы працы. І ва ўсім параўнанне яўна не на нашу карысць.

Каб лепей уявіць сённяшні высокі ўзровень жыцця немцаў, варта параўнаць тагачасныя заходнегерманскія паказчыкі з лепшымі дасягненнямі былой ГДР. Дык вось, у самы яе росквіт ураджайнасць ва ўсходніх землях складала 80%, бульбы і цукровых буракоў — 60—70%, надоі малака — 85%, вытворчасць мяса — 70% ад узроўню ФРГ. А гэта ж была самая квітнеючая краіна сацыялізма, яе візітовая картка. Той узровень сённяшняй Беларусі пры цяперашнім эканамічным курсе нават у перспектыве не дасягнуць...

Зразумела, у той дзень Міліцій Кастрыца як мог супакойваў сваю нямецкую дачку. Пераконваў, што ў нас людзі не галадаюць, маюць нешта, каб сціпла пражыць, яшчэ і дарагіх гасцей ад душы, з размахам сустракаюць. Але педантычным, разважлівым прадстаўнікам Нямеччыны цяжка было ўявіць, як гэта беларусы са сваімі 30—50-доларавымі пенсіямі і заробкамі тут выжываюць. Даспадобы прыйшліся толькі прыгожая прырода і цішыня, гарачая лазня з духмяным бярозавым венічкам, а таксама беларускі пяршак, які не ўступаў знакамітаму шнапсу. Любыя няўзгоды і няўтульнасці не заўважаюцца сярод мілых, сардэчных людзей з беларускай радні.

У час адной з сустрэч за сталом Іаганна так і сказала расчулена, што ёй вельмі хочацца, каб хутчэй на Беларусі наладзілася нармальнае чалавечае жыццё. Калі разабрацца, зусім натуральнае і справядлівае пажаданне. Вось толькі нашу краіну ўслед за цывілізаванымі дзяржавамі не вядуць, а цяпер дык і ўсё больш адварочваюцца ад астатняга свету. Можа, нарэшце, гэта ўсвядомім і пачнём людзьмі звацца?

Уладзімір ШЫК.
Віцебская вобласць.

Факт для роздуму

Вось адкуль могуць пайсці да нас інвестыцыі. Але ці пойдуць?

Днямі Кітайская Рэспубліка (Тайвань) адзначыла сваё нацыянальнае свята. З гэтага выпадку Тайбэйская эканамічна-гандлёвая місія ў Мінску наладзіла прыём, на які сабраліся дзесяткі бізнесменаў, навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў нашай краіны. Не было заўважана толькі ўрадаўцаў, іншых прадстаўнікоў улады.

І вытлумачыць гэта даволі цяжка. Бо па сваім эканамічным патэнцыяле Тайвань займае адно з вядучых месц у свеце. Па аб'еме знешняга гандлю ён займае 14-е месца ў свеце, а па рэзервах замежнай валюты — 2—3 месцы. Вы толькі ўдумайцеся ў гэтую лічбу — 2—3 месцы ў свеце па рэзервах замежнай валюты! Вось адкуль могуць пайсці да нас мільярдныя інвестыцыі. Ды, відаць, адказныя асобы ці то не ведаюць пра гэта, ці то не разумеюць сітуацыі. У адрозненне ад нас Расія раскручвае справы з Тайбэем.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Сітуацыя

Засталіся без святла і... рыбы

Частыя сёлетнія дажджы сталі прычынай выхаду са строю Дабрамысленскай гідраэлектрастанцыі, што ў Лёзненскім раёне, — адной з чатырох міні-ГРЭС, эксплуатацыя якіх аднаўлена на Віцебшчыне. Пасля вайны такія маленькія станцыі давалі святло і энергію шмат куды, у тым ліку ў мясцовую вёску Дабрамысле і ваколіцы. Праз 40 гадоў энергетыкі зноў ажывілі ГРЭС, якая паспяхова працавала, пакуль з-за перапоўненасці вадой у дзвюх месцах не прарвала дамбу і за лічаныя гадзіны не апусцеў вадаём плошчай 57 гектараў.

Магутныя патокі вады праз дзве адтуліны плошчай 15 і 25 метраў хлынулі ў раку Чарніца, а адтуль — у Заходнюю Дзвіну. За кароткі тэрмін любімае месца адпачынку пазбавілася рыбы, а вадасховішча даўжынёй 8 км ператварылася ў смярдзючую багну. Спецыялісты зараз у разгубленасці: ці варта зноў аднаўляць дамбу і нанава запускаць у работу малую гідраэлектрастанцыю, якая давала ў гадзіну 125 кВт электраэнергіі. Нягледзячы на значныя эканамічныя выдаткі, думаецца, ёсць сэнс вярнуць вадаём для служэння людзям. Пакуль жа вады ў ранейшым цудоўным месцы адпачынку засталося мала.

Уладзімір ШАЙКОЎ.

Погуляли...

Трагедией закончилась групповая пьянка в деревне Брылево Гомельского района. В дом к гражданину Суднеко, превратившийся в притон для местных алкоголиков, нигде не работающий сосед Валерий Кульбаков привел еще пару собутыльников. Дальнейшие показания — противоречивы. По словам Суднеко, оставив гостей, он удалился из родного очага по делам. Вернувшись, закурил в коридоре, и тут же раздался взрыв газового котла. Взрывная волна "вынесла" хозяина на улицу. Трупы гостей обгорели до неузнаваемости. Пока опознан лишь один — того самого Валерия Кульбакова.

Виктор КОТОВ, БелТА.

Жыццё як яно ёсць

"Ура! У магазіне масла выкінулі!"

Такі кліч, бы віхура, пранёсся па пад'ездах і паверхах нашага шматнаселенага дома ў "Зялёным Лузе-6". І, нібы віхура, сталі вылятаць (хто можа) ці выбірацца (хто ледзь на нагах трымаецца) людзі з кватэр. Узбуджаныя радаснай весткай, але мучаныя-вучаныя вечнымі дэфіцытамі, некаторыя ішлі ў магазін з недаверам: а мо — нечы жарт, "мастацкі свіст"?

Бягу і я, станаўлюся ў хвасце даволі ладнай чаргі. Нервуюся: ці хопіць? Ці не спазнюся на работу? А па ланцугу ад прылаўка ўжо ідзе: "Гаварыце, каб больш не займалі!". І новыя патэнцыяльныя пакупнікі, толькі што ўзляцеўшыя на крылах надзеі ў свой, звычайна амаль пусты, а цяпер людны універсам, чымсьці нагадваюць... мух, што натыкаюцца на нябачнае шкло. Спяшаліся, беглі, і раптам ад гэтага "Не займаць!" — разгубленыя, збянтэжаныя, бо ў іншых гандлёвых кропках паблізу — глуха...

Стаю, а перад вачыма ўсплывае эпізод з даўняга спектакля ў маскоўскім тэатры. 30-я гады. У сталіцу першай у свеце краіны рабочых і сялян прыязджае знакаміты французскі пісьменнік, які наслухаўся баек пра незвычайныя перамогі сацыялізму ў СССР. Яго возяць на пышныя прыёмы, паказушныя экскурсіі, тэатральныя прэм'еры... Аднойчы слыннага госця запрашае на чай з рускага самавара інтэлігентная маскоўская сям'я. Ён прыходзіць, а гаспадыні дома — няма. Нарэшце, яна на парозе, але ў якім выглядзе! Уся расчырванелая і ўскудлачаная, адзенне пашматана, стары, яшчэ з дарэвалюцыйных часоў, капялюшык з'ехаў набок...

— Што з вамі, дарагая мадам? — усхапіўся з крэсла госць. — Дзе вы былі? Муж пайшоў вас шукаць!

— Я... я... хадзіла ў магазін за булкамі. К чаю. Сёння якраз давалі...

— Давалі? О, як гэта цудоўна — сацыялізм, які дае сваім грамадзянам бясплатны хлеб! — захапляўся француз. — Толькі чаму вы былі ў магазіне так доўга — я гадзіны паўтары вас чакаю.

— Ведаеце... як вам сказаць... — пачырванела яшчэ больш жанчына. — З вечара чаргу заняла, сутак не прастаяла — і вось, бачыце, пашчасціла, піраваць зараз будзем!

— Вы сказалі "чаргу", мадам. А што такое "чарга"? Калі вы з-за яе затрымаліся ў магазіне, чаму не пайшлі ў іншы магазін, дзе гэтай самай чаргі няма? Я ж сам бачыў — у Маскве многа магазінаў.

— Так, многа... Толькі ж, месье, там, дзе няма чаргі. няма і... булак! — выпаліла гаспадыня. І, зусім збянтэжаная тым, што міжволі "раскалолася" і мусіла выдаць замежнаму пісьменніку адну з неад'емных "прелестей" савецкага ладу жыцця, ледзь не страціла прытомнасць.

У сённяшняй чарзе за маслам ніхто, дзякуй Богу, не ўпаў. Але пра дзічэзныя чэргі 30-х гадоў я ведаю не толькі з твораў мастацтва, а і з успамінаў маці, якая падала там не раз. І самой, падлеткам, ужо напрыканцы 40-х у Рагачове, пасля начнога стаяння ля хлебнага магазінчыка і ранішняга, па прыездзе фургона, "штурму" на ганку даводзілася падоўгу ачомвацца на свежым паветры, не верачы, што ўдалося выбрацца з гэтай кашы з боханам у руках. А потым? Ужо настаўнічаючы ў Барысаўскім раёне, за тым жа боханам дабіраліся з вяскоўцамі пешшу (транспарту тады не было) за 18 кіламетраў у райцэнтр.

Чэргі, чэргі — неад'емны "пейзаж" нашай гістарычнай карціны савецкага часу, які, падобна на тое, з усімі сваімі атрыбутамі ўзнаўляецца сёння. Як быццам час спыніўся і... пачаў каціцца назад, а перад вачыма — адно і тое ж: сёння, як і пазаўчора — з маленькім, на "ўчора", перапынкам.

...А чарга, калі прыгледзецца, не такая ўжо і вялікая — чалавек на восемдзесят, толькі паўзе страшэнна марудна. Некалькі касірак у магазіне склаўшы рукі сядзяць, а прадаўшчыца масла сама бярэ плату на месцы. Бывае, яна і зусім надоўга знікае "за кулісамі" — сама ж фасуе масла на "дзяржаўныя" порцыі ў 400 грамаў (паставіць на гэтую справу незанятых работнікаў з іншых аддзелаў у магазіннага начальства канечне ж не ў галаве).

Нарэшце да прылаўка выкатваецца цялежка з пакуначкамі — гандаль працягваецца, чарга ажыўляецца: рухаемся памалу. Але зноў — затор: многія порцыі аказваюцца меншымі за ўстаноўленую норму (паспрабуй нарэзаць цюцелька ў цюцельку). Пакупнікі шумяць, патрабуюць "паложанае": столькі адстаяць і не атрымаць няшчасныя 400 грамаў у адны рукі? Ды гэта ж лічыцца "ў адны рукі", а колькі ратоў у сям'і? І калі яшчэ нарвешся на гэтае некуды знікшае масла?

Немалады хударлявы чалавек ціха-скрушным голасам гаворыць суседцы па чарзе:

— Жонка з раніцы з дому выгнала — шукай дзе хочаш, а без маселка ўнуку на кашу не з'яўляйся. Самі-то мы да ўсяго звычныя, а малому як без кавалачка масла? Не вайна ж.

— Праўда ваша, хоць, скажу, даросламу таксама не зашкодзіла б масла — каўбасы я даўно ўжо не купляю — не па кішэні, а бутэрбродзік з маслам да чаю — вось табе і вячэра, і сняданак. Цяпер жа колькі дзён запар грызу пустую скарынку.

Між тым чарга да запаветнага "маслянага" прылаўка рухалася якраз між дзвюх зашклёных вітрын, за якімі застылі ў халоднай недатыкальнасці з правага боку — каўбасы, з левага — дары мора розных відаў, надта карысныя, як сцвярджае навука, для чалавечага арганізму. Ніякага параўнання з "белай смерцю" — цукрам ці "жоўтай" — тым жа маслам, у якім паўнютка пагібельнага халестэрыну. Яшчэ навука раіць ужываць як мага больш гародніны, садавіны, натуральных сокаў. У дадатак да кавалачка мяса ці рыбы — гэта якраз тое, што трэба для рацыянальнага харчавання!

Але нашы нерацыянальныя грамадзяне чамусьці так і рвуцца да гэтага страшнага халестэрыну, зусім не звяртаючы ўвагі на звабныя каўбасна-рыбныя вітрыны, дзе найменшыя лічбы на цэнніках перавышаюць 250 тысяч.

Дарэчы, цэнніка на сённяшняе масла з-за таўкучкі перад прылаўкам не відаць, нехта просіць прадаўшчыцу назваць кошт.

— Ды гаварыла я, гаварыла, і напісана вось: 128 тысяч васемсот.

— Што-о? Не можа быць! — раздалося ў натоўпе. Якія сто дваццаць восем? Круціце вы тут, махлюеце. На свае вушы чула па радыё — вышэй за сто дваццаць ні за што не будзе.

— Казалі... Вы болей слухайце. Вунь наш прэзідэнт колькі ўсяго казаў-абяцаў, а што спраўдзілася?

— Э, жанчына, ты прэзідэнта не чапай. Пэўна, бэнээфаўка! Ён з усіх сіл стараецца для народа, ды мафія вакол яго не дае разгарнуцца.

— Мафія? Можа і так, толькі хто ж яе садзіў у кіраўнічыя крэслы, як не ён сам? Так што не затыкай, даражэнькі, рот жанчыне, — бэнээфаўка ці не. Яна правільна кажа.

Спрэчкі то сціхалі, то зноў разгараліся. Стары дзяліўся сваёй навіной: пенсію атрымаў з дабаўкай, але яна проста смешная, цэны ж яшчэ раней скокнулі не на жарт. І ўздыхаў журботна:

— Што ж гэта будзе? Усё жыццё на нагах, у турботах. Стаяў ля заводскага станка, па тых жа чэргах. І на пенсіі спакою няма. Зноў чэргі, а кажуць, і талоны зноў увядуць. Прасвету ніякага, за ўнукаў страшна. Пра сябе ўжо і не думаю.

Стары змоўк, засяродзіўся. Мы падыходзілі да доўгачаканай мэты — тут не да размоў: а раптам, як гэта бывае, перад самым носам тавар скончыцца?

Але, дзякуй Богу, дзеду хапіла, будзе сёння ўнук з кашай. А што заўтра — невядома.

І я трымаю ў руках здабыты 50-хвілінным стаяннем-хваляваннем пакуначак у 360 грамаў. Але "ура" крычаць чамусьці не хочацца. Прыйдзецца спалавініць, адвезці кавалачак хворай сястры — ёй цяпер не да магазінаў. Калі спажываць ашчадна, ды яшчэ "ўпрыглядку", то 180 г на тыдзень можна расцягнуць. Яно і да лепшага — халестэрын жа шкодны...

А на дварэ — канец XX веку, разгар "рынкачнага сацыялізму". Так, прастаяўшы жыццё ў бясконцай чарзе, і ўпаўзём, на смех цывілізаванаму чалавецтву, у трэцяе тысячагоддзе ад нараджэння Хрыстова?

Рэгіна ІВАНІЦКАЯ.
Мінск.

Брэст прымае прапановы з Турцыі

Кіраўнікі свабоднай эканамічнай зоны "Брэст" правялі перагаворы з прадстаўнікамі ўрада і дзелавых колаў Турцыі. Госці прапанавалі разгарнуць у зоне гандаль турэцкімі таварамі і наладзіць тут вытворчасць вырабаў са скуры. Па прапанове брэстаўчан дасягнута і папярэдняя дамоўленасць арганізаваць у Брэсце з дапамогай турэцкага боку прадпрыемства па вытворчасці алею.

Цяпер у СЭЗ "Брэст" налічваецца ўжо 59 рэзідэнтаў. Двое з іх зарэгістраваны літаральна днямі. Імі сталі палякі, якім выдзелены зямельны ўчастак для будаўніцтва макаронай фабрыкі.

Іван КУКСА, БелТА.

Сталічных акцёраў цёпла сустрэлі на Гродзеншчыне

Спектаклем "Чорт і баба", пастаўленым па матывах фальклорнай камедыі Францішка Аляхновіча, адкрыліся ў Гродне гастролі Мінскага драматычнага тэатра "Дзе — Я?".

Як стала вядома карэспандэнту БелТА, за два тыдні сталічныя акцёры плануюць паказаць у горадзе на Нёмане яшчэ некалькі сваіх пастановак. У іх ліку — "Жаніцьба" па камедыі Мікалая Гогаля, "Круці..." і "Здань" па творах Фрацішка Аляхновіча і "Распад" па п'есе Мікалая Трухана, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком і дырэктарам гэтага тэатра. У гастрольнай афішы творчага калектыву, які тройчы станавіўся лаўрэатам на фестывалі мастацтваў у Эдынбургу, ёсць таксама два спектаклі для дзяцей: "Дзіва-казка" і "Зачараваная прынцэса".

Большасць спектакляў будзе праходзіць у мясцовым тэатры лялек. Акрамя таго, адбудуцца выязныя выступленні гасцей на прамысловых прадпрыемствах, у навучальных установах і сельскіх клубах.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.

Народная Воля
15 КАСТРЫЧНІКА 1998 г.

Зеркало

Юрий Лужков сталкивает на обочину Геннадия Зюганова

"Паис" (Испания):

"Не пошевелив пальцем, Юрий Лужков попытался набрать очки с помощью протестов, которым он по-видимому был чужд. В день, когда коммунистический лидер Геннадий Зюганов должен был смаковать триумф, именно мэр Москвы, превративший управление российской столицей в великолепный трамплин для президентства, ничем не рискуя, вероятно, извлек самую большую выгоду из недовольства населения кризисом, в который погрузилась Россия.

Теперь Зюганов вынужден будет отбиваться от обвинений в том, что, как и в предыдущих общенациональных выступлениях, он не смог даже опереться на помощь профсоюзов.

А Лужков без необходимости отчитываться за то, что массы не откликнулись так, как на них рассчитывали, получил в подарок обещание профсоюзов поддержать его кандидатуру в президенты.

Ультранационалистический руководитель Владимир Жириновский утверждал, что Лужков "может стать левоцентристским лидером сильнее Зюганова", чья слабина проявилась в ряде столкновений с Борисом Ельциным в последние годы.

Главный соперник московского мэра — Лебедь, если выборы будут досрочными из-за неспособности Ельцина удержаться в Кремле до конца своего мандата. Оба кандидата находятся на националистической орбите, их образ выражает силу и энергию, в которых, как считают многие русские, нуждается их страна в эти трудные времена".

Официально

Главному редактору газеты "Народная воля"

Уважаемый господин Середич!

Выражая Вам свое самое высокое уважение, хотел бы обратиться с просьбой опубликовать в руководимой Вами газете принятое 10.10.98 г. в Софии Положение Консультативного совета по национальной безопасности при Президенте Республики Болгария в связи с конфликтом в Союзной Республике Югославия и ситуации в Косово. Верю, что читателям Вашей газеты будет интересно ознакомиться с содержанием этого важного документа в свете актуального развития сложной ситуации в Косово и целенаправленных усилий Республики Болгария, как соседки Союзной Республики Югославия, для мирного урегулирования конфликта.

ВРЕМЕННЫЙ ПОВЕРЕННЫЙ В ДЕЛАХ РЕСПУБЛИКИ БОЛГАРИЯ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ: /ВАСИЛ ПЕТКОВ/

Положение Консультативного совета по национальной безопасности (КСНБ) при Президенте Республики Болгария от 10.10.98 года

КСНБ при Президенте Республики Болгария выражает единодушное желание мирного разрешения конфликта в Союзной Республике Югославия (СРЮ).

КСНБ присоединяется к оценке ООН, что ухудшение ситуации в Косово содержит опасность для мира и стабильности всего балканского региона.

Поэтому власти Югославии и всех стран конфликта должны немедленно выполнить резолюции 1160 и 1199 Совета безопасности ООН, с тем чтобы дело не дошло до возможного военного вмешательства в рамках НАТО.

Если, в случае крайней меры, дело дойдет до миротворческих военных операций, Болгария их поддержит.

Как непосредственный сосед СРЮ Республика Болгария не примет ни прямого, ни косвенного участия в военных действиях в СРЮ в соответствии с Декларацией Народного собрания от 7 мая 1993 года.

На основании: 1. Конституции, решений Конституционного суда Республика Болгария и законов страны и 2. подписанного 14.02.94 года и ратифицированного Народным собранием 05.04.96 года Рамкового документа "Партнерство ради мира" и "Соглашения между странами членами НАТО и странами партнерами, участвующими в "Партнерстве ради мира", Болгария готова предоставить доступ к своему воздушному пространству в ответ на ноту Североатлантического совета.

Республика Болгария поможет также гуманитарными и логистическими операциями в рамках усилий НАТО для установления и гарантий мира.

От редакции: *поскольку документ носит официальный характер, то "Народная воля" сохранила все нюансы представленного перевода с болгарского языка на русский.*



Фото Влада ЛОКТЕВА.

Людмила Гурченко

"Я никому не должна, кроме себя!"

Как-то после спектакля "Недосягаемая" в Театре Маяковского я неожиданно чуть не столкнулся с ней в одном из мрачных переходов закулисья.

Она шла, а вернее — плыла, рассекая сумрак коридора, в блестящем платье английской леди. Мне пришлось вжаться в стену.

Прошелестев ослепительным нарядом, она проследовала мимо, загадочно улыбаясь и не замечая никого вокруг. Будто герцогиня Мальборо в Букингемском дворце. Действительно недосягаемая...

Почему я вспомнил этот эпизод? Не знаю. Так же, как не знал, о чем буду беседовать с ней, хотя добросовестно готовил вопросы, набросал предварительную схему интервью.

Харьковская девочка, запевшая вдруг голосом Лолиты Торрес, героиня "Карнавальной ночи", прима нашего театра и кино — она, конечно, не вписывалась ни в какие предсказуемые схемы.

Ее любимый Тузик, темная такса, тщательно обнюхал меня у порога, повилял хвостом и пропустил в квартиру.

— Никакого от него толку, — махнула рукой Гурченко. — Любым гостям рад.

— Он же не сторожевой пес, — заступился я за Тузика. — Охотничья норная собака.

— Все в доме перерыл. И под одеяло, как в нору, забирается... А без него уже невозможно. Я знакомым говорю: вы должны переспать с Тузиком, тогда поймете, какая это собака, как от него тепло.

* * *

В гостиной в вазах стоят бледные розы. Она садится напротив, нога на ногу и, повернувшись в профиль, задумчиво смотрит на хмурый день за окном.

— Людмила Марковна, там на улице кризис с дождем и вытекающими последствиями.

— Я скажу, может, жестокую вещь по отношению к себе и другим. Но, по-моему, это так естественно — то, что сейчас происходит... И кто его знает, что такое российская демократия. И как она должна устраиваться... Больно за людей старшего поколения. За десять лет этой новой, как ее назвать... системы они пережили бог знает что. От привычного въевшегося в клетки лозунга "каждому — по труду" к пугающей свободе с мизерными пенсиями. Мне всегда было интересно, наступит ли такое время, когда социалистический лозунг будет работать. Я, помню, когда-то гуляла по Нью-Йорку, наблюдала бомжей и нищих, расположившихся у госучреждений на Пятой авеню. Но не могла себе представить, что когда-нибудь подобное появится у нас. С какой невероятной скоростью произошли эти изменения...

— Но одно в нашем укладе осталось прежним и незыблемым с тех незапамятных времен. И знаете — что?

— Интересно.

— Телевизор. По-прежнему мы забываем обо всех неприятностях у экранов. И, глядя на вас, зритель уверен, что вы не подвержены никаким катаклизмам, неуязвимы для времени.

— Я и не менялась, по-моему, никогда. Точнее, не пыталась себя переделать.

— Наверное, определяющую роль сыграли слова отца, который с детства напутствовал вас: "Иди, дочурка, вжарь як следует быть. Никого не бойся. Дуй свое!".

— Да, наверное, так.

— Свое имя вы получили за два часа до рождения?

— Отец посмотрел тогда популярнейший американский фильм "Акулы Нью-Йорка". Красавец Алан совершал чудеса храбрости ради своей возлюбленной Люси. После сеанса потрясенный папа примчался в роддом и передал записку маме: "Лель! Если в меня будет орел, назовем Алан. Если девычка, хай будет Люси".

— Может, киношное имя и предопределило вашу судьбу?

— Кто знает. Сейчас я отошла от кино. Не удивляйтесь. Сколько можно! В сценарии написано 35 лет, а мне (смеется) 28... Время, отпущенное актеру, чтобы показать себя, заработать денег, очень скоро кончается. Сегодня, пожалуйста, делай, что угодно, но силы-то, здоровье остались ТАМ. Переломы, операции, пирожки, бутербродики, жуткие столовые на съемках. Все на ходу, на бегу. Дикий, дикий темп... Вот случай (смеется). Снимали "Сибириаду". У меня сломана нога. Играем любовную сцену с Михалковым. А нога болит, никак меня не уложат нормально. Что делать? Тут же вытащили девицу из массовки. Мотор! И вдруг Михалков хохочет. Оказывается, в самый ответственный момент она его шепотом спрашивает: "А как фильм-то называется?".

— Вам грех жаловаться на короткую актерскую судьбу. Свои "гастроли" вы начали, если не ошибаюсь, лет в шесть?

— Раньше. Еще в детском саду. Я разглядывала потолок. Сад размещался в старинном особняке, и потолок был изумительно расписан ангелочками, облаками. С тех пор у меня удвоенная любовь и к Микеланджело, и Буше, и Ватто — некий ассоциативный ряд, связанный с детством. Все эти розово-голубые тона. Одно время я даже собирала ангелочков. Глупость, конечно... А в детстве пела перед немцами-оккупантами, чтобы не умереть с голоду. Хотя это были не те немцы, не каратели, не эсэсовцы — просто солдаты, которых погнали на фронт. Без моих тогдашних "заработков" мы бы пропали. Пела однажды в поезде военные песни (их до сих пор поет за столом даже молодежь). Пассажиры насобирали полную шапку денег.

— Людмила Марковна, вы играете в кино, театре, прекрасно поете, танцуете, пишете книги...

— Я еще могу (смеется) спокойно надеть туфли 35-го размера, если это нужно. Хотя сама ношу 38-й...

— Каждый актер должен обладать такими способностями?

— Гениально сказала Раневская: "Врачом, учителем и актером нужно родиться". Плюс еще и каторжная работа, и силы справиться с разочарованием, падением. Всегда, когда я наверху, уже думаю, каково будет падать. Потому что знаю, как это больно без подготовки.

— Первый успех пришел к вам после "Карнавальной ночи". А разочарование?

— Тогда же.

— Странно. Именно этот фильм принес вам популярность, вас стали узнавать на улицах.

— Успех картины был невероятным. Просто ошеломляющим. Сейчас уже можно об этом говорить. В книге я написала довольно скромно. Сейчас уже никто не будет завидовать. Это прошло. Тот человек, которым тогда была я, — умер, давно исчез. Я говорю об этом, оглянувшись. И, наверное, еще долго буду оглядываться — там позади огромная дорога медных труб...

* * *

Возникает пауза, которую она, актриса, умеет держать долго. За окном какие-то моросящие завихрения.

— Не знаю, почему-то вспоминается замечательный плакат, разделенный на две части. С одной стороны цветной, с другой — черно-белый. "Дорогу таланту!" — на скрипке вдохновенно играет молодой человек. И черно-белая часть: "Дорога таланта" — скрипач со смычком и скрипкой, весь несчастный, скукоженный. Не знаю точно, что он олицетворял. Скорее всего, две системы. Но это неважно.

После "Карнавальной ночи" за мной ходили толпы поклонников. У меня было одно серенькое платьице — от него буквально отрывали кусочки на память. Посыпались приглашения на концерты. А у меня чулок не было. Я брала у пианистки чулки, и она разворачивала пианино так, чтобы не видели ее ног.

Папа вообще ничего не понимал. Он же был советским человеком. Всем сердцем за Родину, за Сталина. "Як же так, дочурка сидить, усе ее знають, а мы ей деньги посылаем — за комнату надо платить, одеть нема чего...". Он никак не мог понять. Такой успех, такая слава. А меня прописывают домработницей для того, чтобы я поступила на Мосфильм, потому что Мосфильм не принимал без прописки. В "Комсомолке" выходит статья "Чечетка налево", где разоблачаются мои нелегальные выступления. Одна в Москве в 20 лет. Знаете, это был мощный мозговой удар.

— И все же потом было множество замечательных фильмов, ярких ролей. Не рано ли вы собрались прощаться с кинематографом?

— А я не прощаюсь. С чего это вы решили? Может быть, свершится чудо и всплывут еще одни "Старые стены". Смотрю фильм — и удивляюсь: неужели это я? Как я могла сыграть это? Только на пике отчаяния. В общем, лечу и думаю: или колоссальный бросок вперед, или сотрут в порошок. Что-то за гранью сознания. Бог с ним — что будет, то и будет! Может, летальный исход? А может, суицид? Сколько можно жить без работы? Зачем?

* * *

— А в театре проще? Я, например, не представлял вас в роли урожденной английской леди. Но после спектакля "Недосягаемая" готов был присягнуть, что Харьков — побратим города Лондона.

— Английская леди тоже женщина. Такая же, как в зале. Со своими бедами, радостями, ощущениями. Конечно, походка, манеры, общение без говорка. Но за это, извините, мне деньги платят. А исходила я из того, что она такая же женщина... Когда готовишься к новой роли, переживаешь ее, проглатываешь, в тебе рождается эмбрион. Он растет, мучает, постепенно вытесняет тебя, создавая другого человека. Так было и с "Недосягаемой".

— В работе вам много помогает муж. Немногословный, интеллигентный человек. Но он либо чересчур скромен, либо настолько засекречен вами, что о нем почти ничего не известно.

— Сергей Михайлович — человек очень талантливый и чрезвычайно умный. Уникально слышит фальшь. Человек он непростой, очень гордый, честолюбивый, как и полагается мужчине. А он — настоящий мужчина. Он не умеет сгибаться. Говорит правду в глаза, порой жестко. После жизни с человеком, который фальшивил и лгал, это было непривычно и даже больно. Но, вы знаете, я впервые в жизни почувствовала себя защищенной. А для женщины это, наверное, самое главное.

— На редкость безупречный портрет. Вы — идеальная пара?

— Что вы! Мы абсолютно разные люди. Он весь в себе, я — наоборот. Знаете, такие "in" и "out". Но в то же время единство вкусов, понимание, уважение. А недостатки я должна научиться прощать. Хотя мне это непросто.

Я один раз видела его в беспомощном состоянии. Я тогда умирала. Умирала не в спектакле, а по-настоящему. Редкое заболевание, похожее на заражение крови. Меня срочно доставили с гастролей из Прибалтики в Москву. Шанс на поправку был один из ста. И вот, когда наступил кризис, ему сказали, что я могу... надо готовиться... А я неожиданно пришла в себя. Прошептала или прохрипела: "Не плачь, я жива".

— А едва поднявшись с больничной койки, снова играли на сцене...

— В спектакле была лестница, по которой я поднималась с неимоверным трудом. Все куда-то уплывало. Но ничего. Спектакль сыграли.

— Насколько я понял, все ваши силы сейчас направлены на театр?

— Я оставила театр.

— Вы шутите?

— Абсолютно серьезно. Ушла из Театра Чехова. Играю в спектаклях Театра сатиры.

— Чем это вызвано?

— Было замечательное время. И вдруг все остановилось, а потом кончилось. Я почувствовала, что у режиссера как бы пропал интерес к моему спектаклю. Ну что ж... Я услышала, как несколько раз он сказал, что это не его спектакль. Он же его ставил, он принес мне пьесу... Очень многое на подсознательном уровне... Хорошо работается только в атмосфере любви, взаимного восхищения. А если нет... Это ведь тоже своеобразная семья.

— Вероятно, существуют вещи, которые сложно простить?

— В жизни я много всякого насмотрелась, но никогда не могу понять и простить, когда тебя любят и улыбаются, и так искренне, что ты веришь и ценишь, а за спиной вынашивают стратегические планы твоего падения... Внезапного, неожиданного. Когда нет времени сгруппироваться. Это сильно ожесточает. Резко отвечаешь на удар, а потом или думаешь, или понимаешь — а стоило ли вообще все это... Это длинный разговор... Очень страшно доверяться, открывать душу. Маски, маски. А как увидишь лицо без...

* * *

Честно говоря, я несколько растерялся от ее признаний. Не хочет сниматься в кино, ушла из театра.

Народная артистка по-прежнему сидела вполоборота и задумчиво смотрела в окно. На диване устроился Тузик и преданно глядел на хозяйку. Чтобы как-то заполнить паузу, я попросил ее вспомнить любой забавный эпизод из актерской жизни. Она без особого энтузиазма стала перебирать разные истории: "эту я уже рассказывала", "об этом писали"... Но, случайно оглянувшись на Тузика, улыбнулась:

— В апреле играли "Поле битвы после победы принадлежит мародерам". В спектакле есть фрагмент, когда мы с партнером приезжаем в лес поговорить наедине. И вдруг в зрительном зале отчетливо лает собака. Мы на сцене опешили. В голове сумбур: откуда? Может, кто из зрителей пронес на руках маленького пса? Зал насторожился. Вдруг снова раздается лай. И я понимаю, что это не песик, а настоящий барбос. Что делать? Рождается реплика: "Ты говорил: тишина, а тут собаки лают!". Зал упал... Холод, слякоть, собака тихонько проскользнула вместе с публикой. Погреться...

— Чем вы занимаетесь, когда удается побыть дома?

— Всем понемногу. Отдыхаю, читаю, думаю, вышиваю. Что вы улыбаетесь? Вышивка это тоже искусство. Вообще люблю сама все делать.

— Скажите, а новые аранжировки старых песен? Или работа с господином Эм.Си.Павловым над творчеством Маяковского не предвидится?

— Маяковский — это наш отечественный рэп. Чего стоят его замечательные строчки-лесенки. Но нужно этим заниматься. А времени катастрофически не хватает.

— Значит, у вас все-таки есть какой-то проект, над которым вы работаете?

— Боюсь даже и говорить. Не просто проект...

— Спектакль? Кино?

— Не спешите. Я сама расскажу. По порядку. Я прочитала рассказ Агаты Кристи. И он запал мне в душу. Сначала я не понимала почему. И вдруг дошло. В нем мысль для готового мюзикла.

— Мюзикл по мотивам Агаты Кристи?

— Это рассказ о женщине. Одиночество при живом муже. О мистическом бюро счастья, где шеф — сам дьявол. Он и берется устроить заново жизнь этой дамы. Появляется молодой человек, и женщина становится прекрасной, заново расцветает. Муж пытается вернуть ее. Такая вот ситуация. Короче, это побег от одиночества, разочарования. Рискованный побег в неизведанное.

— Мне кажется, что для нашей публики все это прозвучит необычно, но весьма интригующе. Дело за исполнителями.

— Исполнители уже работают. В главных ролях: Николай Фоменко, Гедеминас Таранда, Александр Михайлов, Алена Свиридова и многие другие звезды. Эм.Си.Павлов тоже в составе. Режиссер — Андрей Житинкин. Музыку написал Виктор Лебедев. Авторы — Александр Бородянский и Юрий Ряшенцев. Художник и сценограф — Андрей Шаров. Аранжировки Анатолия Кальварского. По-моему, достаточно имен плюс большой симфо-джазовый оркестр — 50 человек и оригинальный балет Александра Посвянского.

— Получается грандиозное действо...

— Мы долго вынашивали эту идею. Если хватит сил ее осуществить, сбудется мечта всей моей жизни.

— Вы сказали: "Если хватит сил"... Травмы, житейские переломы, военное детство, нынешний кризис... Откуда их взять — эти силы?

— Пью витамины (смеется)... Не знаю. Есть такая ария в нашем новом мюзикле: "Жизнь — как дым. Что же ты молчишь, Москва? Как мне жить, подскажи, мудрые найди слова...". Все время анализируешь: туда или сюда, вверх или вниз, рано или поздно? Помните, у Толстого — князь Андрей: "Жизнь еще не кончена в 31 год окончательно и бесповоротно" (смеется)... И опять фантазируешь, надеешься. А как иначе? Никто не имеет права пускать жизнь на ветер. И если есть возможность, ты должен... Хотя никто никому не должен.

Я должна... Хотя тоже никому...

Только себе.

Петр ВОРОНКОВ.

Віншуем!

Яго завуць Алесь Белакоз...

У Мастоўскім раёне на Гродзеншчыне ёсць невялікая маляўнічая вёска Гудзевічы, цэнтр сельскага савета і мясцовага калгаса імя Карбышава. Тут знаходзіцца вядомы на ўсю Беларусь, у блізкім і нават далёкім замежжы Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музй, які ў гэтым годзе адзначыў сваё 30-годдзе.

У музеі — 13 залаў (літаратурныя, этнаграфічныя, народнай медыцыны, гісторыі вёскі ды іншыя). Стваральнікам і нязменным кіраўніком музея з'яўляецца былы выкладчык беларускай мовы і літаратуры мясцовай сярэдняй школы, выдатнік народнай асветы і заслужаны дзеяч культуры Беларусі, адзін з першых узнагароджаных медалём Францыска Скарыны, сапраўдны волат беларускага духу Алесь Мікалаевіч Белакоз. Яму нядаўна споўнілася 70 гадоў.

Праз усё сваё свядомае жыццё Алесь Мікалаевіч з глыбокім патрыятызмам і зайздроснай грамадзянскай мужнасцю актыўна адстойваў і адстойвае ідэю незалежнасці роднай Бацькаўшчыны. Ён актыўна шчыруе на ніве нашага нацыянальнага Адраджэння і ўвогуле праводзіць велізарную грамадскую, выхаваўчую і гісторыка-краязнаўчую работу. Алесь Мікалаевіч — гарачы абаронца роднай мовы, захавальнік багатай спадчыны продкаў.

Шаноўныя жыхары Беларусі! Калі каму з вас давядзецца трапіць на Мастоўшчыну, то раю неведаць Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей, гэты цудоўны астравок непадробнай беларушчыны на зрусіфікаванай Беларусі.

А можа, збярыцеся сюды нават спецыяльна. Упэўнены, што не пашкадуеце!

Апрача азнаямлення з разнастайнай і багатай экспазіцыяй музея, тут вы зможаце асабіста пазнаёміцца з незвычайным чалавекам — легендай нашага краю Алесем Мікалаевічам Белакозам.

Прапаную вашай увазе прысвечаны яму верш.

Гудзевіцкаму волату

Ёсць Асоба на Божым загадкавым свеце,
Пазнаецца якая па гэткай прыкмеце:
Аж да мозгу касцей Беларус ён увесь;
Белакоз — яго прозвішча, імя — Алесь.

Бліз паўвека рупліўца і плённа, і чынна
Нясе крыж на асветніцкай ніве Айчыны.
У мінулым — у школе, цяпер — у музеі.
Дапаможа ў любой разабрацца падзеі.

Цуд-музей стаў сапраўднай народнай крыніцай,
Да якой мы прыходзім духоўна лячыцца.
Цуд-музей ад бяспамяцтва лечыць, бязродства,
Ад усякага цяжкага іншага ўродства.

Шчыра рад, што ў твае сем дзесяткаў гадоў
Для Айчыны сваёй працаваць шчэ гатоў.
Дык прымі ж віншаванне з такое нагоды
І шчыруй ўсім наўздзіў яшчэ доўгія годы!

З павагай і найлепшымі пажаданнямі Алесь ЛЯСКОЎСКІ, настаўнік-пенсіянер.

в. Сучакі Ваўкавыскага раёна.

Рэха

Дык на якой мове ўсё ж жадае размаўляць народ?

Прачытаў ліст у "Народнай волі" Івана Васілеўскага. Нельга не заўважыць, што ў нечым нашы з ім лёсы падобныя: абодва зараз пенсіянеры, абодва шмат гадоў пражылі за межамі сваёй радзімы — у Расіі. Абодва карысталіся там выключна рускай мовай. Абодвум там, у далечыні ад Бацькаўшчыны, не аднойчы снілася Беларусь. І мы абодва не раздумвалі, куды ехаць, калі выйшлі "на заслужаны адпачынак". А сёння абодва выпісваем "Народную волю"...

На гэтым падабенства нашых з Іванам Андрэевічам лёсаў заканчваецца. Ён так, на жаль, заблытаўся між дзвюх соснаў, што мне, шчыра кажучы, зрабілася шкада яго, чалавека майго пакалення, амаль равесніка. Наважыўся выказаць сваю думку наконт таго, аб чым ён напісаў, хаця ні ў якім разе не чакаю, што Іван Андрэевіч адразу пагодзіцца са мной ці загамоніць па-беларуску...

